# «ГАДЗІНА МОВЫ» З «УПЭЎНЕНАСЦЮ»

**Учора, у Міжнародны дзень роднай мовы, у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі ўрачыста адкрылася выстава «Гадзіна мовы».**



На выставе ўпершыню прадстаўлены сем мадэляў гадзіннікаў завода «Луч» лімітаванай калекцыі «Мова», выпушчаныя ў 2019–2022 гг.

Апошнія рэлізы калекцыі прысвечаны народнаму паэту Беларусі — Пімену Панчанку з нагоды 105–годдзя з дня яго нараджэння. За аснову дызайна Мінскі гадзіннікавы завод узяў першы зборнік вершаў паэта — «Упэўненасць» 1938 года, у якім усхваляецца хараство і багацце роднай зямлі.

«Прыхільнікам беларускай літаратуры добра вядома імя Пімена Панчанкі — паэта і публіцыста, крытыка і перакладчыка. Галоўнае ў яго творчай спадчыне — вершы, у якіх выказваюцца думкі і надзеі эпохі, вершы, у якіх адлюстроўваецца багатая гама чалавечых пачуццяў. Яго паэзія, непаўторная і глыбока нацыянальная, назаўжды ўвайшла ў залаты фонд беларускай літаратуры мінулага стагоддзя», — адзначыў **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША**.

На адкрыцці выставы прысутнічала ўнучка Пімена Панчанкі — Кацярына Андрэеўна Панчанка, дызайнеры і аўтары калекцыі «Мова» з Мінскага гадзіннікавага завода.

Экспазіцыя будзе працаваць у Музеі кнігі да 21 сакавіка.